**НЯПОЎНЫ СКАЗ** – гэта прэдыкатыўная адзінка, у якой адсутнічае канструкцыйна неабходны галоўны або даданы член сказа. Такая адсутнасць выяўляецца пры параўнанні няпоўнага сказа з адпаведным поўным: *Гаспадыня пільнуецца хаты, дзяцей, гаспадар – поля, лугу, лесу* (Б. Сачанка); адрозніваюць наступныя тыпы няпоўных сказаў:

***развітыя і неразвітыя***: *Мы ехалі з малым сынам – было яму восем гадоў – да бабулі ў вёску. Дарога была далёкая. Прыехалі ў Слуцк раніцаю. Да вёскі пеша ішлі кіламетраў пятнаццаць* (В. Вітка); *Плыве вецер над вячэрнім горадам. Плыве і шуміць* (К. Чорны);

***ускладненыя і няўскладненыя***: *Ждан і Шура Рыжык ідуць апошнія. Іх захапіла хараство возера. Ішлі і пазіралі то на дрэвы..., то на ціхую, празрыстую, як сляза, ваду Свіцязі...* (У. Дамашэвіч); *Па левы бок стаялі ў абароне нашы войскі, па правы – варожыя* (І. Чыгрынаў).

Няпоўныя сказы могуць быць часткамі складаных сказаў: *На гары шуміць хваіна, а ў даліне вербалоз* (П. Трус); *Па тым, як нашы рэкі дыхаюць хвалямі, лясы – лістотай, палі – каласамі, хмары – громам, а людзі – роднымі песнямі, пазнаецца, як ім жывецца* (М. Танк).

Паводле семантычных і структурных асаблівасцей няпоўныя сказы могуць быць:

1) структурна і семантычна няпоўныя, сярод якіх вылучаюць ***кантэкстуальныя*** і ***сітуацыйныя***;

2) структурна няпоўныя, а семантычна поўныя; такія сказы адносяць да ***эліптычных*** (гл. **ЭЛІПТЫЧНЫ СКАЗ**),

3) структурна поўныя, а семантычна няпоўныя; гэта сказы, у якіх ролю дзейніка выконваюць няпэўныя займеннікі: *Нехта спяшаецца, камусьці не спіцца...* (С. Грахоўскі); *Хтось палюе на сініцу, нехта ловіць жураўля...* (Г. Бураўкін).

1. ***Кантэкстуальныя сказы*** – структурна і семантычна няпоўныя сказы, у якіх адсутны член ўзнаўляецца з папярэдняга кантэксту: *Толькі вуліца здавалася вузенькаю. А ўспаміналася шырокаю. І хаты – вялікімі і прасторнымі* (А. Жук).

Найчасцей апускаюцца ў няпоўных кантэкстуальных сказах:

**дзейнікі**: *На залітай сонцам маладой сасонцы прыхарошвалася вавёрка. Пераскокваючы з адной на другую галінку, кідала на мяне цікаўныя позіркі* (У. Мяжэвіч);

**выказнікі**: *З таго часу хто называе гай Зарэчным, хто Гаўронавым. Кастусёў бацька – Гаўронавым* (А. Капусцін);

**дзейнікі і выказнікі**: *Азаровічу раптам прыгадалася, як у маленстве баяўся цемнаты, і на яго пытанне: “Адкуль яна бярэцца?” – бацька, пасміхаючыся ў вусы, адказваў: “З лесу”* (Д. Нічыпаровіч).

Зрэдку апускацца могуць і даданыя члены сказа – **акалічнасці** і **дапаўненні**: *Убачыўшы салдата, які праходзіў па двары, ён* [*Пецзя*] *запытаўся:*

*− Гэй, зямляк, скажы, якое сёння чысло?*

*− Першага верасня, − адказаў той, нават не павярнуўшы ў Пецеў бок галаву* (І. Сіняўскі);

*І Яўхім не падпісаў ліста. Проста так, без подпісу, у канверт усунуў і адаслаў у райком, першаму сакратару таварышу Багавіку* (Б. Сачанка).

Асаблівым выпадкам структурнай і семантычнай непаўнаты трэба лічыць ужыванне ў дыялогу даданай часткі без галоўнай: *Згадалася, як, вярнуўшыся дахаты, узбіралася на матчыны калені, пыталася:*

*− Мама, а чаму нас вучаць на чужой мове гаварыць? Чаму там не гавораць так, як дома?*

*− Бо там чужыя настаўнікі* (І. Мележ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. ***Сітуацыйныя сказы*** – структурна і семантычна няпоўныя сказы, у якіх адсутны член ўзнаўляецца з улікам сітуацыі маўлення (абставін, умоў, уласнага вопыту); Як правіла, такія сказы выкарыстоўваюцца як рэплікі маўлення персанажаў: *Раптам Захар паказаў улева рукой, зашаптаў:*

*− Глядзі, глядзі… Вунь, ля ракіты.*

*Убачылі ўсе: за ракітай піла ваду аленіха. За некалькі крокаў ад яе стаяла на тоненькіх ножках алянятка…* (М.Воранаў); *Пашкадавалі**?*** *– кіўнуў ён* [*Васіль Лазавенка*] *на сасну-прыгажуню, што засталася стаяць пасярод лесасекі* (І.Шамякін).

Да сітуацыйных няпоўных сказаў далучаюцца пабуджальныя рэплікі з прапушчаным дзеясловам-выказнікам: *Вось ён* [*Паўлюк Трус*] *бярэ разгон і на ўвесь голас гукае:*

*− Хлопцы, дарогу!* (С. Шушкевіч);

*− Устаць! – закрычаў ён* [*Агееў*] *на ўсё горла, каб перакрычаць грукат бою. – Наперад!* (В.Быкаў); *– Ва ўкрыццё**!*** *– крыкнула Вера* (У. Савіцкі).

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ